**РЭЗАЛЮЦЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ**
**да Канферэнцыі «Новая Беларусь» 2026**

# АБ ПАДТРЫМЦЫ БЕЛАРУСАЎ, ЯКІЯ СТАЛІ НА АБАРОНУ УКРАІНЫ, БЕЛАРУСКІХ ВЕТЭРАНАЎ І ІХ СЕМ’ЯЎ

8–9 жніўня, Варшава

З першых дзён поўнамаштабнага расійскага ўварвання сотні грамадзян Беларусі сталі на бок Украіны: служаць у Сілах абароны Украіны, аказваюць валанцёрскую і гуманітарную дапамогу і зазнаюць рэпрэсіі за падтрымку Украіны. Беларускія вайскоўцы пяты год удзельнічаюць у абароне краіны, дзясяткі з іх загінулі, сотні атрымалі раненні і інваліднасць, частка знаходзіцца ў палоне. У Беларусі не менш за 403 чалавекі былі асуджаныя за розныя формы падтрымкі Украіны, і палітычна матываваны пераслед працягваецца.

Рэжым Лукашэнкі застаецца саўдзельнікам расійскай агрэсіі, а тэрыторыя Беларусі працягвае заставацца фактарам ваеннай пагрозы для Украіны і рэгіёну. Пацвярджаючы прыхільнасць мірнаму і прававому дэмакратычнаму пераходу ў Беларусі і падтрымліваючы права Украіны на самаабарону ў адпаведнасці з арт. 51 Статута ААН, беларускія дэмакратычныя сілы прызнаюць службу беларусаў у Сілах абароны Украіны законнай формай падтрымкі гэтага права.

У межах гэтай рэзалюцыі асноўная ўвага надаецца грамадзянам Беларусі, якія на законных падставах служаць або служылі ў Сілах абароны Украіны, а таксама членам сем’яў загінулых, зніклых без вестак, палонных, параненых і асоб, якія набылі інваліднасць у сувязі са службай. Паняцці «беларускія вайскоўцы» і «ветэраны» выкарыстоўваюцца ў тэксце як агульныя абазначэнні і не падмяняюць юрыдычных статусаў, вызначаных заканадаўствам Украіны.

Мы канстатуем, што прававы статус, сацыяльная абарона, лячэнне, рэабілітацыя і прафесійная рэінтэграцыя беларускіх вайскоўцаў і ветэранаў па-ранейшаму патрабуюць сістэмных рашэнняў. Гэтая рэзалюцыя вызначае асноўныя прынцыпы абароны іх правоў, прызнання службы і захавання прафесійнага досведу, а таксама пазіцыю ў дачыненні да беларусаў, якія зазнаюць рэпрэсіі за падтрымку Украіны.

## I. ГУМАНІТАРНЫ НАПРАМАК

### 1. Прававы статус і мабільнасць

У шэрагу выпадкаў беларускія вайскоўцы і ветэраны сутыкаюцца з абмежаваннямі пры атрыманні або аднаўленні беларускіх дакументаў, што можа ствараць рызыкі прававой

нявызначанасці і ўскладняць іх легалізацыю. У супрацоўніцтве з Украінай і еўрапейскімі партнёрамі мы будзем дамагацца далейшага ўдасканалення механізмаў іх легалізацыі, у тым ліку ў выпадках адсутнасці сапраўднага пашпарта, стварэння зразумелых працэдур атрымання праязных дакументаў для лячэння, навучання і іншых абгрунтаваных паездак, а таксама празрыстых механізмаў гуманітарнай абароны і сямейнага ўз'яднання ў краінах ЕС і Украіны.

Законная служба ў Сілах абароны Украіны не павінна выкарыстоўвацца трэцімі дзяржавамі як падстава для выдачы, дэпартацыі або іншага прымусовага вяртання чалавека ў Беларусь, калі існуе рызыка палітычнага пераследу, катаванняў або іншага парушэння яго правоў.

**2. Сацыяльныя гарантыі, лячэнне і адаптацыя**

Беларускія грамадзяне, якія законна служаць або служылі ў Сілах абароны Украіны, павінны мець недыскрымінацыйны доступ да гарантый, выплат і кампенсацый, прадугледжаных заканадаўствам і ўмовамі іх службы. Мы заклікаем ліквідаваць неабгрунтаваныя прававыя і адміністрацыйныя бар'еры, якія перашкаджаюць вайскоўцам, ветэранам і членам іх сем'яў рэалізоўваць такія правы.

Мы будзем садзейнічаць уключэнню беларускіх ветэранаў у ўкраінскія і еўрапейскія праграмы медыцынскай і псіхалагічнай рэабілітацыі, пратэзавання, прафесійнай перакваліфікацыі, працаўладкавання і прававой падтрымкі.

**3. Беларусы, рэпрэсаваныя за падтрымку Украіны**

Асобна мы звяртаем увагу на беларусаў, якія зазналі палітычна матываваны пераслед за падтрымку Украіны, антываенную дзейнасць, перадачу інфармацыі пра расійскую ваенную актыўнасць, ахвяраванні або спробы далучыцца да Сіл абароны Украіны. Мы патрабуем неадкладнага вызвалення ўсіх, хто пазбаўлены волі па такіх справах, спынення палітычна матываванага пераследу, перагляду вынесеных прысудаў і аднаўлення парушаных правоў.

Беларускія грамадзяне, якія знаходзяцца ў палоне ў сувязі са службай у Сілах абароны Украіны, павінны ўлічвацца ў адпаведных перамоўных, гуманітарных і абменных механізмах, а іх сем'і — атрымліваць даступную інфармацыю пра іх лёс і неабходную падтрымку

## II. ПРЫЗНАННЕ СЛУЖБЫ І ВЫКАРЫСТАННЕ ВЕТЭРАНСКАГА ДОСВЕДУ

**4. Прызнанне і захаванне досведу**

Удзел беларусаў у абароне Украіны з'яўляецца часткай сучаснай беларускай гісторыі і супраціву расійскай агрэсіі. Вопыт, атрыманы беларускімі вайскоўцамі і ветэранамі падчас службы, павінен быць захаваны, асэнсаваны і выкарыстоўвацца ў адукацыйных, экспертных і прафесійных фарматах.

За гады вайны беларускія добраахвотнікі атрымалі практычны досвед сучасных баявых дзеянняў, кіравання падраздзяленнямі, тактычнай медыцыны, беспілотных сістэм, сувязі і

іншых тэхналагічных кірункаў. Мы заклікаем Украіну і еўрапейскіх партнёраў уключаць беларускіх ветэранаў у экспертныя, аналітычныя і навучальныя праграмы. Вопыт беларускіх вайскоўцаў і ветэранаў можа стаць важным рэсурсам пры падрыхтоўцы будучай сістэмы нацыянальнай бяспекі Беларусі, заснаванай на вяршэнстве права і дэмакратычным грамадзянскім кантролі. Яго выкарыстанне павінна адбывацца на аснове прафесійных патрабаванняў, празрыстых працэдур адбору і належнай праверкі.

**5. Прававая яснасць службы і прафесійная перспектыва**

Грамадзяне Беларусі, якія законна служаць або служылі ў Сілах абароны Украіны, не павінны сутыкацца праз такую службу са стратай прававога статусу, сацыяльных гарантый або рызыкай пераследу ў краінах пражывання.

Неабходна забяспечваць магчымасць прызнання дакументальна пацверджаных кваліфікацый і прафесійнага досведу, атрыманага падчас службы, а таксама доступ да далейшага навучання, перакваліфікацыі і працаўладкавання ў адпаведнасці з заканадаўствам адпаведнай дзяржавы.

**6. Падтрымка і бяспека**

Мы падтрымліваем дапамогу Сілам абароны Украіны, у складзе якіх служаць беларусы, праз афіцыйныя дзяржаўныя і легальныя валанцёрскія механізмы і ў адпаведнасці з заканадаўствам краін-партнёраў.

Прыярытэтам павінны заставацца тыя формы падтрымкі, якія непасрэдна зніжаюць рызыку для жыцця і здароўя вайскоўцаў: сродкі індывідуальнай абароны, тактычная медыцына, сувязь, тэхналагічныя рашэнні, а таксама развіццё прававой, кансультацыйнай і рэабілітацыйнай інфраструктуры для беларускіх вайскоўцаў і ветэранаў ва Украіне і краінах ЕС.

## III. АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ БЕЛАРУСКІХ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ

Беларускія дэмакратычныя сілы абавязваюцца падтрымліваць рэгулярны дыялог з добраахвотніцкай і ветэранскай супольнасцю і ўлічваць яе пазіцыю пры выпрацоўцы рашэнняў, якія непасрэдна закранаюць вайскоўцаў, ветэранаў і іх сем’і.

Мы будзем сістэмна прасоўваць пытанні іх прававога статусу, сацыяльных гарантый, лячэння, мабільнасці і адаптацыі ў дыялогу з Украінай, інстытуцыямі ЕС, урадамі краін-партнёраў і міжнароднымі арганізацыямі, а таксама дамагацца ўвагі да беларусаў, якія знаходзяцца ў палоне або рэпрэсаваныя за падтрымку Украіны.

Мы будзем падтрымліваць дакументаванне злачынстваў і пераследу ў дачыненні да беларускіх добраахвотнікаў, ветэранаў і іх сем’яў і садзейнічаць перадачы адпаведнай інфармацыі міжнародным механізмам правасуддзя.

Мы таксама будзем дамагацца прадстаўленасці беларускіх вайскоўцаў і ветэранаў у экспертных і міжнародных фарматах, дзе абмяркоўваюцца бяспека рэгіёну, будучыня Беларусі і фармаванне яе дэмакратычнага сектара бяспекі.

Нашай агульнай асновай застаюцца правы чалавека, суверэнітэт і незалежнасць Беларусі, недапушчальнасць яе ўдзелу ў агрэсіі супраць Украіны і непазбежнасць адказнасці за рэпрэсіі і злачынствы.

*Офіс Святланы Ціханоўскай,*
*Аб’яднаны Пераходны Кабінет,*
*Каардынацыйная Рада,*
*Платформа палітычных партый*